Культпаход

# АД ТАЛСТОГА ДА ШЭКСПІРА

## У Магілёве набірае абароты XVI Міжнародны маладзёжны тэатральны форум «M@rt.кантакт-23»

**На плошчы каля абласнога драмтэатра адбыўся вулічны перформанс і па чырвонай дарожцы прайшліся тэатральныя калектывы, эксперты і арганізатары мерапрыемства. Сярод іх вядомы рэжысёр, кіраўнік прыватнага драмтэатра ў Екацярынбургу «Калядa-тэатр» Мікалай Каляда, заслужаная артыстка Расійскай Федэрацыі Алена Барзова, расійскі рэжысёр Яўген Лаўцоў. Парадавала, што на плошчы сабралася шмат моладзі, дзеля якой, у прынцыпе, і адбываецца дзейства. Пра цікавасць да форуму сведчыць і тое, што білеты на тэатральныя пастаноўкі былі практычна раскуплены яшчэ ў студзені. У праграме 19 пастановак тэатральных калектываў з чатырох краін — Беларусі, Расіі, Казахстана, Балгарыі.**

— Вельмі важна, што ў гэтыя сакавіцкія дні ў Магілёве арганізоўваецца такое актыўнае тэатральнае асяроддзе, — адзначыў **намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый МАЛАШКА.** — Сюды прыязджаюць вядучыя тэатры нашай краіны, з Расіі, Казахстана, Балгарыі. Мы бачым розныя інтэрпрэтацыі класічных твораў. Форум захоўвае сваю міжнароднасць ва ўсіх адносінах. Вельмі важна, што на форуме прысутнічае такое значнае экспертнае асяроддзе — вядомыя тэатральныя крытыкі і тэатразнаўцы. Усе білеты прададзеныя, значыць, ёсць цікавасць да форуму, ёсць людзі, якім гэта патрэбна і важна. Усе міжнародныя выклікі пераадольваюцца не палітыкамі, а простымі людзьмі.



Спачатку ідзе культура, зносіны. І такія мерапрыемствы вельмі важныя для ўмацавання сувязяў.

Форум распачала пастаноўка мінскага тэатральнага праекта «ТрыТфармаТ» «Карэніна», якая выклікала шмат розных меркаванняў. Не менш драматычная гісторыя паказана на малой сцэне тэатра, дзе сабраліся прыхільнікі артыста Магілёўскай філармоніі Паўла Усовіча. У яго монаспектаклі «Я — найлепшы», дзе ён раздзяліў жыццё на сем умоўных тыдняў, шмат цікавых разважанняў пра сяброўства, нянавісць, пошукі асабістага шчасця.

Калі глядач усе сцэнічныя падзеі ўспрымае на аматарскім узроўні, заўсёды цікава і карысна даведацца, што пра іх думаюць прафесіяналы. Сёлетні «M@rt.кантакт» зноў дорыць магчымасць далучыцца да аўтарытэтных думак экспертаў і разабрацца ў сучасных тэатральных тэндэнцыях. Тэатральны форум у Магілёве менавіта тым і цікавы, што дазваляе паглыбляцца ў даследаванне эксперыментальных формаў, новых плыняў тэатральнага мастацтва. Гэтых думак чакаюць і артысты, і рэжысёры, бо заўсёды цікава, як іх работу ўспрымаюць тэатразнаўцы.

Тым часам фестываль толькі набірае абароты і наперадзе яшчэ шмат цікавых спектакляў. **Музычна-тэатральны крытык Надзея БУНЦЭВІЧ** ужо вылучыла некалькі для сябе. Папершае, гэта Гомельскі маладзёжны тэатр з яго фантастычнай драмай «451° па Фарэнгейту: шлях Кларысы» і «451° па Фарэнгейту: шлях Мілдрэд». «Вельмі цікавы калектыў, імкнецца да сусветных тэндэнцый, адкрывае новыя імёны і п'есы», — кажа Надзея Бунцэвіч. Па-другое, яна з задавальненнем распавядае пра работу балгарскіх артыстаў тэатра «Сляза і смех» — «Агнес, жонка Уіла».

— Гэты спектакль я ўжо бачыла на фестывалі «Белая Вежа» ў Брэсце і была прыемна ўражана, — прызнаецца суразмоўніца. — Гэта п'еса тэатральнага крытыка Ніны Мазур, якая неадназова прыязджала ў Магілёў на «M@rt.кантакт». Яна даследуе творчасць Уільяма Шэкспіра з боку яго жонкі. І робіць тое бліскуча».

Вынікі ж форуму, як заўсёды, абвесцяць у Міжнародны дзень тэатраў 27 сакавіка. Пераможцу будзе ўрачыста ўручаны галоўны фестывальны прыз — «Залатая маска». Яшчэ дзве ўзнагароды атрымаюць і тыя два спектаклі, якія будуць прызнаны найлепшымі па выніках галасавання гледачоў і на думку маладзёжнага журы. Астатніх удзельнікаў форуму ўзнагародзяць «Сярэбранай маскай». Дарэчы, паўплываць на лёс пастаноўкі можа і сам глядач. Для гэта трэба пасля спектакля апусціць свой квіток у спецыяльную ўрну.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.08 | 19.26 | 12.18 |
| Віцебск — | 6.57 | 19.16 | 12.19 |
| Магілёў — | 6.58 | 19.16 | 12.18 |
| Гомель — | 6.55 | 19.12 | 12.17 |
| Гродна — | 7.24 | 19.41 | 12.17 |
| Брэст — | 7.24 | 19.42 | 12.18 |

## Месяц

*Маладзік 21 сакавіка. Месяц у сузор'і Авена.*

## Імяніны

*Пр.* *Наталлі, Валерыя, Дзмітрыя, Івана, Ілы, Мікалая, Пятра, Рыгора, Сяргея, Тараса.*
*К.* *Катарыны, Багуслава, Захарыя, Паўла, Казіміра.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

### 22 САКАВІКА

У краіне

**1893** год — нарадзіўся (г. Гомель) Мендэль Маркавіч Хатаевіч, партыйны і дзяржаўны дзеяч. З 1913-га — член Палескага камітэта РСДРП(б). У 1914-м арыштаваны і сасланы ў Сібір. У 1917-м — кіраўнік Гомельскай арганізацыі РСДРП(б), член выканкама Гомельскага савета. У 1919-м — старшыня Гомельскага павятова-гарадскога камітэта РКП(б), член Гомельскага рэўкама. З 1920-га — на Заходнім фронце. З 1921-га — сакратар Гомельскага, з 1923-га — Адэскага губкамаў РКП(б). У 1924—1925 гг. — у апараце ЦК ВКП(б). З 1925-га — сакратар Татарскага абкама, з 1928-га — Сярэдняволжскага крайкама ВКП(б). З 1937-га — другі сакратар ЦК КП(б)Украіны. У 1937-м рэпрэсіраваны і прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Памёр у 1939-м. Рэабілітаваны ў 1956-м.



**1908** год — нарадзіўся Уладзімір Піліпавіч Лемеш, беларускі вучоны ў галіне заатэхніі, доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі.

**1943** год — фашысцкія карнікі спалілі беларускую вёску Хатынь і яе жыхароў. Загінулі 149 чалавек, у тым ліку 75 дзяцей. У жывых засталіся толькі пяцёра дзяцей і адзін дарослы — Іосіф Камінскі. У 1969-м на месцы вёскі ўзведзены мемарыяльны комплекс у памяць аб ахвярах фашызму ў Беларусі. Архітэктары — Юрый Градаў, Валянцін Занковіч, Леанід Левін, скульптар — Сяргей Селіханаў.

**1973** год — нарадзілася Таццяна Уладзіміраўна Аўдоніна, беларуская спартсменка (водныя лыжы), майстар спорту СССР, майстар спорту Беларусі міжнароднага класа, заслужаны майстар спорту Беларусі.

У свеце

**1923** год — нарадзіўся Марсэль Марсо, французскі акцёр-мім. Заснавальнік Міжнароднай школы мімадрамы ў Парыжы.



**1938** — нарадзіўся Віктар Гаўрылавіч Захарчанка, расійскі кампазітар, народны артыст РСФСР і Украіны.

**1948** год — нарадзіўся Эндру Лойд-Уэбер, брытанскі кампазітар і прадпрымальнік. Аўтар папулярных мюзіклаў «Кошкі», «Прывід оперы», «Ісус Хрыстос — суперзорка» і інш.

**1958** год — нарадзіўся Валерый Міладавіч Сюткін, заслужаны артыст, прафесар кафедры вакалу і мастацкі кіраўнік эстраднага аддзялення МДДУ імя М. А. Шолахава, аўтар тэкстаў песень для гурта «Брава».

Так гаварыў...

**СТАНІСЛАЎ ЛЕМ:**

*«Факты тым і адрозніваюцца, што перавага заўсёды на іх баку».*

### УСМІХНЕМСЯ

**— Сынок, чаму ў кватэры беспарадак?**

**— Вечарынка была з сябрамі.**

**— А піяніна дзе?**

**— Даў паслухаць.**

Гаспадар:

— Вам грыбочкі пакласці?

Госць:

— Не, дзякуй, я грыбы толькі збіраць люблю!

Гаспадар:

— Як пажадаеце! Магу і па падлозе раскідаць.

**Цяжка рабіць бізнес у адзіночку.**

**Бухгалтар — ты.**

**Прыбіральшчык — ты.**

**Прадавец — ты.**

**Грузчык, які запіў і не выйшаў на працу, падставіўшы ўсю кампанію, — ты.**



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10.681. Індэкс 63850. Зак. № 655.

Нумар падпісаны ў 19.30 21 сакавіка 2023 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12